А.Т. Каліноўская,
наменснік начальніка аддзела навукова-метадычнага забеспячэння аховы гісторыка-культурнай спадчыны ДУА «Інстытут культуры Беларусі»,
кіраўнік танцавальнай студыі гурта «Guda»

# Навучанне практыкам захавання традыцыйнай танцавальнай культуры

Беларуская традыцыйная танцавальная культура надзвычай багатая і разнастайная. Стагоддзямі беларускі народ ствараў мноства яркіх, самабытных, змястоўных і розных па форме танцаў. У танцавальнай творчасці праз яскравыя мастацкія вобразы выяўляюцца тыповыя народныя рысы і асаблівасці, перадаюцца думкі, пачуцці, настрой, адносіны да жыццёвых з'яў [4]. Такое выразнае, эмацыянальнае пражыванне рэчаіснасці не страціла актуальнасці ў сучасным свеце і застаецца запатрабаваным не толькі для выхавання дзяцей і моладзі, але і для рэалізацыі форм мастацкай адукацыі дарослых. Менавіта традыцыйны народны танец дазваляе праявіць сябе людзям любога ўзросту, розных мастацкіх здольнасцей, фізічнай падрыхтоўкі і прафесійных кампетэнцый.

Узоры танцаў могуць быць пераняты ў сваёй мясцовасці ад старэйшых. Сёння яшчэ сустракаюцца носьбіты традыцыі, якія пры адпаведных умовах могуць узгадаць і паказаць тыя танцы, якія былі папулярнымі на танцавальных вечарынах падчас іх маладосці. Такія вечарыны з жывой музыкай і багатым мясцовым танцавальным рэпертуарам паступова спынілі сваё існаванне толькі ў 70-х гг. XX ст. Можна смела сказаць, што традыцыя не забыта і не страчана, і аднаўляць яе магчыма не толькі з этнаграфічных запісаў і кніг. Гэта асабліва важна таму, што пераймаюцца не толькі рухі. Людзі імкнуцца падзяліцца сваімі пачуццямі, настроем, з якім яны танцавалі, расказаць пра характар кожнага танца, яго асаблівасці, правілы выканання. Узаемаадносіны з носьбітамі — вельмі важны момант у пераемнасці традыцыі. Ствараць адпаведную атмасферу дапамагаюць гарманіст ці музычная капэла, пачастункі, душэўныя размовы. Такое творчае ўзаемадзеянне паміж пакаленнямі каштоўнае для любога ўзросту.

Маляўнічая і разнастайная народная харэаграфія ўключае ў сябе шматлікія жанры народнага танцавальнага мастацтва [1; 6]. У жывой традыцыі дайшлі да нас шматлікія варыянты побытавых танцаў, часцей за ўсё гэта парныя танцы, розныя полькі, сольна-гуртавыя варыянты «Барыні», «Рускага», «Лявоніхі». Радзей можна сёння сустрэць цалкам выкананыя шматфігурныя танцы — кадрылі, полькі, «Шэн», «Нажнічкі» і інш. У многіх мясцовасцях былі свае непаўторныя варыянты кадрылі, назвы якіх утвораны ад назваў вёсак, дзе іх танцавалі, напрыклад, Дэмбраўская кадрыль, Грабаўская, Конкавіцкая. Менавіта таму захаваныя варыянты ўяўляюць вялікую каштоўнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Важна выкарыстоўваць у навучанні вялікую беларускую харэаграфічную спадчыну, бо кожная група танцаў дазваляе развіваць новыя бакі танцавальнага майстэрства [2; 5].

Парныя танцы — самыя шматлікія і найбольш папулярныя сёння. Сярод іх можна вылучыць як традыцыйныя беларускія танцы («Лявоніха», «Мяцеліца», «Каваль», «Верабей» і інш.), так і вялікую колькасць асіміляваных танцаў, якія выконваюцца пад мелодыі, што прыйшлі з суседніх краін. За даволі працяглы час бытавання на нашай тэрыторыі танцы набылі асаблівасці мясцовай народнай харэаграфіі, і іх прынята разглядаць як беларускія танцы. Чым раней танец з'явіўся на нашай зямлі, тым больш мясцовых варыянтаў узнікла. Часта адрозненні прасочваюцца ад вёскі да вёскі. Таму заўсёды цікава не толькі вывучыць агульнавядомыя варыянты, але і знайсці мясцовыя. Многія этнаграфічныя рэгіёны маюць свае асаблівасці танцаў «Кракавяк», «Гапак», «На рэчаньку», «Ночка», «Субота», «Ойра» і інш. Гарадскія побытавыя танцы, што прыйшлі ў вёску праз гарадское асяроддзе, таксама зазналі моцны ўплыў народнай харэаграфіі і захавалі толькі некаторыя выразныя асаблівасці свайго паходжання, якія можна заўважыць у такіх танцах, як «Карапет», «Базар», «Субота», «Каханачка», «Падыспань». У ХХ ст. актыўна засвойваліся ў народным асяроддзі вальс, факстрот, танга. Усе гэтыя танцы з простым і цікавым харэаграфічным малюнкам дазваляюць хутка далучыць і зацікавіць як слухачоў, якія засвойваюць адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі, адукацыйную праграму навучальных курсаў, так і шырокую публіку падчас імпрэз. Асабліва дарэчы тут аказваюцца танцы са зменай пар, тройкамі, гуртавыя танцы, танцы-гульні (напрыклад, «Юрачка», «Явар», «Цяцерка», «Падыспань» — са зменай пар, «Лявоніха» — тройкамі).

Значную частку традыцыйнай танцавальнай спадчыны складаюць шматфігурныя танцы. Гэта танцы тыпу кадрылі, полькі з камандамі, парна-гуртавыя варыянты «Лявонíхі», «Мяцеліцы», «Лянцея» і інш. У народзе іх называюць часам «доўгімі». Вялікая колькасць розных фігур («кален» ці «штроф») патрабавала не толькі пэўнага часу, але і зладжанасці танцораў, адзінага рытму ўзаемадзеяння пар між сабой, з музыкантамі, кіраўніком танца.

Многія вёскі мелі свае адметныя варыянты кадрыляў, полек ці іншых шматфігурных танцаў. Два з іх сёння ўключаны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь: «Котчынская кадрыля» (в. Котчына Мастоўскага р-на Гродзенскай вобл.) і «Спораўская полька» (в. Спорава Бярозаўскага р-на Брэсцкай вобл.). Гэты спіс, безумоўна, яшчэ папоўніцца непаўторнымі ўзорамі традыцыйных танцаў розных мясцовасцей.

Рухаючыся ад простага да складанага ў засваенні танцавальных традыцый, мы прыходзім да вялікай групы танцаў, узоры якіх ствараюцца спантанна ў працэсе выканання. Імправізаваныя формы танцаў, якія ў Беларусі называюцца скокамі, існуюць у парным, сольным, сольна-гуртавым выкананні. Сярод іх сустракаюцца вельмі старажытныя, у тым ліку абрадавыя, напрыклад «Мікіта», «Таўкачыкі»,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

«Каза», «Жабка». Прастор для імправізацыі даюць шматлікія полькі, розныя варыянты «Барыні» ці «Рускага».

Сёння, калі танцавальныя імпрэзы з жывой музыкай і сапраўднымі народнымі танцамі адбываюцца не часта, засваенне скокаў пачынаецца з працяглага вывучэння розных танцавальных рухаў, якія ўвайдуць пазней у танцавальную імправізацыю. Але для гэтага патрэбна адпаведная атмасфера творчай свабоды, эмацыянальнага ўздыму, разняволенасці, якая вядзе да жадання выказаць сябе праз сольны танец. Падобныя ўмовы імкнуцца стварыць арганізатары конкурсаў беларускіх танцаў, што праводзяцца як на рэспубліканскім узроўні ў рамках фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня», так і на мясцовым у многіх абласцях і раёнах краіны. Часцей за ўсё ўдзельнікамі конкурсаў з’яўляюцца дзеці, але групы дарослых танцораў таксама ладзяць эфектныя часткі праграмы, асабліва калі ўдаецца заахвоціць да ўдзелу людзей старэйшага пакалення, носьбітаў традыцыі.

Важнейшая задача ў практыцы адукацыі дарослых — пашырэнне тэматычнага спектра адукацыйных праграм [3, с. 5]. Крыніцай ДАД паступова становіцца ўся традыцыйная культура, а танцавальная творчасць здольна аб’яднаць розныя кірункі народнага мастацтва. Многія з тых, хто зацікавіўся народным танцам, пачынаюць паступова асвойваць і іншыя жанры традыцыйнай культуры: фальклорныя спевы, інструментальную музыку, асновы рамёстваў па вырабу строяў, каляндарна-абрадавыя практыкі свайго рэгіёна.

На падставе заняткаў са слухачамі, якія вывучаюць змест адукацыйных праграм ДАД у Інбелкульце, абмену досведам з тымі, хто прымяняе практыкі захавання традыцыйнай танцавальнай культуры ў рэгіёнах, можна адзначыць, што вывучэнне і засваенне адзначаных практык спрыяе эмацыянальнаму, творчаму развіццю асобы і набыццю практычных уменняў і навыкаў, забяспечвае якасны ўзровень рэлаксацыі і сацыялізацыі чалавека ў сучасным грамадстве.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. *Алексютович, Л.К.* Белорусские народные танцы, хороводы, игры / Л.К. Алексютович. — Минск : Выш. шк., 1978. — 350 с.
2. *Высквварка, С.Г.* Беларускі танцавальны фальклор : методыка працы з дзіцячым калектывам / С.Г. Выскварка. — Мінск : Выд. Зміцер Колас, 2015. — 84 с.
3. Дополнительное образование взрослых : опыт программно-методического обеспечения / сост. С.И. Тарарышко. — Минск : Пропилеи, 2012. — 180 с.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. — Мінск : Выш. шк., 2001—2013. — Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн. / А.М. Боганева [і інш.]; агул. рэд. Т.Б. Варфаламеевай. — Кн. 2. — 2006. — 608 с.
5. *Чурко, Ю.М.* Белорусский хореографический фольклор / Ю.М. Чурко. — Минск : Выш. шк., 1990. — 416 с.
6. *Чурко, Ю.М.* Вянок беларускіх танцаў / Ю.М. Чурко. — Мінск : Беларусь, 1994. — 87 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ